*Дзяніс Дук (Наваполацк)*

# УНІКАЛЬНАЯ ЗНАХОДКА З ПОЛАЦКА — КЕРАМІЧНАЯ ЧАРНІЛЬНІЦА З ВЫЯВАЙ КНЯЗЁЎ БАРЫСА І ГЛЕБА

У 2003 г. падчас археалагічнага нагляду за будаўнічымі работамі на тэрыторыі былога Барысаглебскага манастыра ў г. Полацку (сучасная вул. Юбілейная) знойдзена сценка керамічнай пасудзіны з антрапаморфнымі выявамі. Сценка пасудзіны паходзіць са стратыграфічнага пласта і была выяўлена падчас зачысткі сценкі будаўнічай траншэі.

Траншэя цеплатрасы шырынёй 1,5 м і глыбінёй ў сярэднім 1—1,5 м перасякала былую манастырскую тэрыторыю з паўднёвага-ўсходу на паўночны захад. Даўжыня траншэі па ахоўнай зоне культурнага пласта склала каля 300 м (Дук, 2003).

Вядома, што на тэрыторыі Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра знаходзіліся чатыры мураваныя храмы XII ст.: Вялікі сабор, Пятніцкая і Барысаглебская царква, Храм-трыконх. Траншэя цеплатрасы праходзіла у непасрэднай блізкасці да Пятніцкай царквы і перасякала Барысаглебскую царкву, што прывяло да спынення земляных работ і змены праекта пракладкі цеплатрасы ў абыход храма.

У датаваным пласце (умоўны адрэзак цеплатрасы В-С) (мал. 1: 1) на адлегласці каля 30 м ад Барысаглебскай царквы была знойдзена унікальная знаходка — сценка керамічнай чарнільніцы поўнага профілю з выявай князёў Барыса і Глеба.

Паўднёвая сценка адрэзку В-С, з якога паходзіць чарнільніца, мае даўжыню 7 м. Культурны пласт магутнасцю ад 1 да 1,4 м складаецца з трохчастковай структуры (мал. 1: 2). Верхні пласт магутнасцю да 0,8 м, у сярэднім — 0,6 м аднародны, светла-шэрага з карычневым адценнем колеру, з бясформеннымі лінзамі вапны да 5 см, развалам цаглянага друзу ў выглядзе канкрэцый па 5—10 см, сухі, камкаваты, месцамі зярністы з-за дамешак супесі. Падчас зачысткі сценкі знойдзены нешматлікія побытавыя рэчы XIX—XX стст. (фабрычныя цвікі, посуд, кавалачкі кафлі). Сярэдні стратыграфічны гарызонт — слаба выражаная прапластка вуголля магутнасцю 0,05 м — у межах кв. 2—7 перакрывае 15-сантыметровую глыбістую прапластку керамічнага друзу і вапны. Знаходак не выяўлена. Трэці, ніжні стратыграфічны гарызонт — гэта пласт аднароднай светла-шэрай глебы, камкаватай і сухой, магутнасцю 0,2—0,4 м, у кв. 1—0,6 м з лакальнымі канкрэцыямі да 10 см керамічнага друзу з вуголлем. Мацярык — светла-жоўты, сухі зярністы пясок аднароднага жоўтага колеру.

У межах кв. 1 пад 5-сантыметровай вугальна-вапнавай прапласткай да мацерыка ў трэцім стратыграфічным гарызонце падчас зачысткі сценкі траншэі былі знойдзены наступныя артэфакты: венцы гаршкоў XV—XVI стст., зробленыя на ручным ганчарным крузе (мал. 2: 1—3), кавалачкі плінфы і поўны профіль сценкі керамічнага начыння з рэльефнымі антрапаморфнымі выявамі (мал. 4: 2). Апошні артэфакт унікальны па тэхніцы выканання і па мастацкіх уласцівасцях.

Начынне зроблена на нажным ганчарным крузе, малюнак прадрапаны па вільготнай гліне, а асобныя элементы адзення нанесены метадам карбавання. Зроблена рэканструкцыя знешняга выгляду гэтага вырабу (мал. 2: 4).

Вышыня сценкі начыння 8,8 см з улікам таўшчыні накрыўкі была не меней за 9 см. Дыяметр донца 8,4 см, венца — 9 см. Таўшчыня сценак і донца адпаведна 0,8 і 0,5 см. Выраб сфармаваны на нажным ганчарным крузе (з унутранага боку захаваліся характэрныя сляды ў выглядзе гарызантальных палосак-штрыхоў), аднак донца і накрыўка даляпляліся пасля фармоўкі вырабу. Край донца загладжаны пальцамі, як і паверхня начыння каля малюнка. Таўшчыня накрыўкі каля 0,4 см. Керамічнае цеста добра вымешанае, з дамешкамі пяску. Чарапок аднароднага шэрага колеру, вонкавая паверхня практычна чорная. Верагодна, разбурэнне вырабу адбылося пры абпале па прычыне неадпаведнасці тэхналогіі фармоўкі выраба: донца і накрыўка былі нетрывала прымацаваны да сценак. Гэтая асаблівасць — магчымае сведчанне недакладнасці валодання ганчаром тэхналогіяй фармавання начынняў на нажным ганчарным крузе, што дапушчальна для XVI ст.

Малюнак нанесены драўляным стэкам пасля фармоўкі вырабу па вільготнай гліне*. Асобныя дэталі адзення і імітацыя літар на кнізе над антрапаморфнымі выявамі нанесены шляхам карбоўкі. Уся кампазіцыя змешчана ў нешырокай рамцы (падвойнай з левага краю), паміж рамкай і антрапаморфнымі выявамі прамаляваны крылы анёлаў (мал. 4: 2). На сценцы начыння выяў было некалькі — не менш чатырох, усе яны былі змешчаны ў прамавугольныя рамкі. Як можна меркаваць па захаванаму фрагменту, памеры кампазіцыі былі аднолькавыя: 4 x 6,5 см.

Відавочна ўзнікаюць два асноўныя пытанні: чые выявы адлюстраваны на фрагменце начыння і якая была функцыянальная прыналежнасць вырабу ў цэлым?

Пачнем з адказу на першае пытанне. Выява двух антрапаморфных фігур — ні што іншае, як перадача вобразаў князёў Барыса і Глеба. Такое заключэнне вынікае з двух аргументаў. Першы, чарнільніца знойдзена непасрэдна каля падмуркаў царквы Барыса і Глеба, другі

* Вызначэнне зроблена мастаком-рэстаўратарам Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка А. А. Хатулевай, за што прыношу ёй шчырую падзяку.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




*Мал. 1. План размяшчэння часткі траншэі цеплатрасы з адрэзкам В—С на тэрыторыі Бельчыцкага манастыра (1) і стратыграфія паўднёвай сценкі адрэзку С—В траншэі цеплатрасы (2)*

асноўны аргумент вынікае з характару стылізацыці выяў. Абедзве фігуркі знешне падобныя, перададзены дастаткова ўмоўна, з усіх дэталяў адзення найбольш рэалістычна прамаляваны галаўныя ўборы. Іх малюнак на абедзвюх фігурках аднолькавы: гэта высокія трапецыяпадобныя шапкі накшталт княжацкіх вянцоў. Згодна з іконаграфічнай праваслаўнай традыцыяй XVII ст. княжацкія (царскія) вянцы перадаваліся менавіта такім чынам. Варта прывесці выяву цара на мсціслаўскай кафле сярэдзіны XVII ст. з аналагічным галаўным уборам (мал. 4: 1)*.

* На малюнку выява цара змешчана побач з выявай св. Георгія на кані.

Найбольш імавернае функцыянальнае прызначэнне керамічнага начыння — чарнільніца. Па-першае, кніга адлюстравана ўверсе над выявамі князёў Барыса і Глеба. Па-другое, аналагічная па прапорцыях і канструкцыі керамічная чарнільніца была знойдзена ў Полацку старшым навуковым супрацоўнікам Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка А. А. Салаўёвым падчас археалагічнага нагляду на тэрыторыі Вялікага пасаду. Выраб у пашкоджаным выглядзе захаваўся цалкам, на сённяшні дзень ён адрэстаўраваны і захоўваецца ў фондах НПГКМЗ (мал. 3).

Па тэхналагічных прыкметах абедзве чарніліцы ідэнтычныя і зроблены з шэра-карычневай добра ад-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




*Мал. 2. Венцы гаршкоў з ніжняга стратыграфічнага гарызонту адрэзка В—С (1—3) і рэканструкцыя знешняга выгляду чарнільніцы (4)*



*Мал. 3. Керамічная чарнільніца з фондаў НПГКМЗ*

мучанай гліны без грубых дамешак. Паверхня шурпатая, загладжаная ў верхняй частцы, амаль чорная як звонку, так і знутры.

Чарнільніца з фондаў НПГКМЗ не ўтрымлівае выяў, аднак падабенства формы і блізкасць прапорцый з вышэйзгаданым фрагментам відавочнае. Верхняя яе частка захавала адбіткі пальцаў рамесніка ў выглядзе чатырох барознаў шырынёй 0,7 см. Дыяметр донца — 7,8 см, венца — 10,5 см, вышыня сценак 8 см, агульная вышыня выраба з улікам накрыўкі 9,5 см. Накрыўка чарнільніцы мае адтуліну дыяметрам 1,5 см, яшчэ адна гарызантальная адтуліна зроблена ў вушку накрыўкі, тут яе дыяметр складае 0,9 см. Адтуліна ў вушку можа сведчыць аб тым, што чарнільніца падвешвалася на вяровачцы. Праз адтуліну ў накрыўцы можна прапусціць пяро і пры неабходнасці закрыць коркам.

Чарнільніца з фондаў НПГКМЗ была знойдзена ў недатаваным пласце, таму адзіным храналагічным маркерам могуць з'яўляцца яе тэхналагічныя прыкметы. Як у першым, так і ў другім выпадку накрыўкі прымацаваны да сценак пасля фармоўкі вырабаў на нажным ганчарным крузе, аднак у апошняй чарнільніцы накрыўка прытоплена ад краю на 1,2 см для прыдухілення выцякання чарнілаў. Сценкі начыння тонкія — каля 0,5 см. Паводле згаданых прыкмет выраб датаваны другой паловай XVI—XVII стст.

Мастацкія вартасці чарнільніцы з Барысаглебскага манастыра вельмі адметныя. Як і стылізацыя мсціслаўскай кафлі, выява на чарнільніцы рэдкая ў беларускім сярэднявечным мастацтве і адпавядае праваслаўнай іканаграфічнай традыцыі (Īemigala, 1998, s. 268). Напрыклад, сюжэт магілёўскай кафлі, дзе святы Георгій забівае цмока, выкананы ў стылі заходнееўрапейскага барока (Марзалюк, 1998, мал. 44, 2). Стылізацыя выяў князёў Барыса і Глеба на фрагменце полацкай чарнільніцы вельмі падобная па выяўленчых вартасцях да выявы мсціслаўскай кафлі і з'яўляецца пакуль што адзінкавым прыкладам дэкаратыўнага аздаблення керамічнага начыння такога кшталту. У адрозненне ад мсціслаўскай кафлі, малюнак на чарнільніцы нанесены мастаком без выкарыстання матрыцы, што сведчыць аб непаўторнасці гэтага твора дэкаратыўнага мастацтва.

Прыкметамі для вызначэння часу стварэння вырабу з'яўляюцца: 1) факт выкарыстання нажнога ганчарнага круга, 2) месцапалажэнне рэчы ў стратыграфічным пласце, 3) архаічная праваслаўная традыцыя выканання выявы, аналагічная выяве на мсціслаўскай кафлі.

Традыцыя перадачы выяў у сярэднявечным мастацтве магла існаваць дзесяцігоддзі і нават стагоддзі. Стратыграфічныя даныя без правядзення археалагічных раскопак не з'яўляюцца поўнымі, можна вылучыць толькі храналагічны дыяпазон керамікі з трэцяга стратыграфічнага гарызонта, якая маркіруе пласт, з якога паходзіць фрагмент чарнільніцы, XV—XVI стст. Час распаўсюджвання нажнога ганчарнага круга ў Полацку прыпадае на другую палову XVI ст., інтэнсіфікацыя гэтага працэсу адбываецца ў першай трэці XVII ст. Такім чынам, найбольш імавернае дataванне чарнільніцы— мяжа XVI—XVII стст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



1



2

*Мал. 4. Мсціслаўская кафля з выявай св. Георгія (1) і сценка керамічнай чарнільніцы з Полацка (2)*

ЛІТАРАТУРА

*Дук Д. У., 2003.* Справаздача аб археалагічным назіранні за пракладкай траншэі цеплатрасы на тэрыторыі былога Барысаглебскага манастыра г. Полацка ў 2003 годзе. — Архіў ІГ НАНБ. Спр. № 2078.

*Марзалюк І. А., 1998.* Магілёў у XII—XVIII ст. Людзі і рэчы. Магілёў—Мінск, 1998.

*Żemigala M., 1998.* Nowożytne kafle pieczowe z Kalisza na podstawie znalezisk z terenu zamkowego // PMMAEL. № 40. S. 97—204.

***Dzianis Duk***

**A UNIQUE FIND FROM POLATSK — THE CERAMIC INC-POT WITH AN IMAGE OF DUKES BARYS AND GLEB**

Summary

Basing on stratigraphic and historical-comparative methods, the author discusses typological and cultural attributes of a ceramic pottery wall with anthropomorphic images. The unique artifact comes from Polatsk and was found during the archeological supervision of construction work on the territory of the former Belchytsy St. Barys and Gleb monastery. The reconstruction of the pottery was carried out and it was stated to be an ink-pot with dukes Barys's and Gleb's images. The stylization of the dukes' images on Polatsk ink-pot fragment is so far the only example of decorative pottery adornment of such type. The most plausible dating of the ink-pot is the border of XVI and XVII centuries.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова